УДК 372.8821.6.

*І.М. ЛЯВОНЕНКА*

# НА ШЛЯХУ ДА ПЕДАГАГІЧНАЙ ТВОРЧАСЦІ
## (ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ УРОКА-ГУЛЬНІ)

*З адзінаю на кожны ўрок*
*Іду жаданаю мэтай:*
*Што гэта будзе новы крок*
*Пазнання вучнем свету.*
В.М.Гуркевіч [3, с. 5]

Цяпер шмат гаворыцца пра неабходнасць творчага падыходу да выкладання гуманітарных дысцыплін у школе. Аднак пакуль што пра творчасць і прынцып творчага падыходу больш размоў, чым рэальнага выкарыстання іх у працы з вучнямі. І гэта невыпадкова. На жаль, надзвычай мала спецыяльна распрацаваных методык, дапаможнікаў і падручнікаў. Нават гэтыя асобныя выданні не ў стане забяспечыць імкненне настаўнікаў да глыбокіх і рознабаковых ведаў, памножаных на ўласную творчасць. Таму менавіта цяпер неабходна звярнуцца і да асобы настаўніка-творцы, які самы звычайны ўрок змог бы пераўтварыць у невялікі спектакль, надаць яму атмасферу мастацкага пошуку. Бо агульнавядома: "творчасць, апантанасць, нястомнае імкненне шукаць і знаходзіць, жыва рэагаваць на ўсе прагрэсіўныя ідэі ў айчыннай педагогіцы, шчырая ўлюбёнасць у настаўніцкую прафесію" [3, с. 3] – тыя "кіты", на якіх трымаецца педагогіка.

Вядома, што многія настаўнікі не задаволены вынікамі сваёй працы. І ў той жа час пэўная іх частка працягвае працаваць па-ранейшаму. З аднаго боку гэта зразумела. Кожны настаўнік – асоба з уласным светаўспрыманнем, звычкамі, рысамі характару, стылем працы. Падчас вельмі цяжка перакрэсліць уласныя, даўно практыкаваныя метадычныя падыходы і пачаць дзейнічаць па-новаму. Як паказвае вопыт, настаўнік самаўхіляецца ад вырашэння гэтых актуальных пытанняў не толькі таму, што не хоча, а хутчэй таму, што не ведае, як гэта рабіць, не заўсёды ўяўляе сабе, на што здатны ён і яго вучні, не адчувае, дзе неабходна змяніць свае метадычныя падыходы. У святле гэтага трапна заўважыў вядомы расійскі псіхолаг Л.С.Выгодскі: "Навучыць творчаму акту мастацтва нельга, але гэта зусім не значыць, што нельга выхавальніку садзейнічаць у яго адукацыі і праяўленні" [1, с. 247].

У педагагічнай навуцы і практыцы ўсё больш акрэслена адчуваецца патрэба ў пераадоленні несуаднесенасці паміж агульнаметадычнымі ўяўленнямі пра вучня і творчы патэнцыял асобы дзіцяці ва ўсіх яе праяўленнях, з аднаго боку, і ў забеспячэнні патрэб ва ўжо распрацаваных канцэпцыях спецыфічных формаў творчасці, а тым больш у асобных даследаваннях і практычных рэкамендацыях, з другога.

Яшчэ адна надзённая праблема заключаецца ў тым, што настаўнік цягнецца да методык, праграм, формаў адукацыі ва ўмовах, калі сам вучань выключаны са сферы індывідуальнай увагі. Вось чаму ўзнікае патрэба гуманных і ўважлівых адносін да вучня на аснове яго індывідуальнасці, асаблівасцяў яго характару. Зразумела, што гэта магчыма толькі пры ўмове, калі настаўнік сам будзе творчай асобай, і будзе ўспрымаць вучня не толькі розумам, але і сэрцам. Гэта асабліва важна ўлічваць, паколькі большасць настаўнікаў у якасці асноўных крытэрыяў паспяховай адукацыі вылучаюць працаздольнасць, паслухмянасць і здольнасць дзіцяці,

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

вучня запамінаць матэрыял, але гэта не мае нічога агульнага з фактарамі, што вызначаюць якасць педагагічнага працэсу. Творчасць, гуманістычна-асабовы падыход да кожнага вучня – вось падмурак педагагічнага поспеху.

"Кардынальнае абнаўленне вучэбнага працэсу, руйнаванне застарэлых стэрэатыпаў патрабуюць працяглага часу і галоўнае – новага настаўніка, які валодае актыўнымі метадамі навучання", – сцвярджае аўтар шматлікіх даследаванняў у галіне замежнай і параўнальнай педагогікі З.А.Малькова [4, с. 27]. Усё гэта магчыма, калі настаўнік імкнецца да аптымальных вынікаў. Маральныя і фізічныя цяжкасці, эканамічныя праблемы, перагружанасць урокамі накладваюць асаблівую адказнасць на настаўніка і ўзмацняюць фактар залежнасці вынікаў яго работы не толькі ад уласных ведаў, педагагічных уменняў і навыкаў, але і ад пачуцця адказнасці за працу, творчага стаўлення да яе. Менавіта дзякуючы гарманічнай суаднесенасці названых якасцяў, настаўнік будзе здольны адпавядаць патрабаванням падрыхтоўкі моладзі ў сучаснай школе.

Згодна з меркаваннямі спецыялістаў "свабода творчасці ў ліку іншага забяспечваецца "сумяшчальнасцю" вучня і настаўніка пры падрыхтоўцы і завяршэнні творчага акта, чым тлумачацца ўсім добра вядомыя факты, калі ў адных педагогаў дзеці дэманструюць дзівосы творчага ўяўлення, а ў іншых – мізэрнасць фантазіі" [5, с. 106].

Агульнымі для ўсіх творчых асоб з'яўляюцца неабходнасць пастаяннага развіцця і росту. Развіццё творчых здольнасцяў вучняў мае вялікае значэнне і для эфектыўнага навучання ва ўмовах выбару будучай прафесіі. Гэтаму, як правіла, спрыяе глыбокае засваенне вучнямі сістэмы ведаў, стымуляванне іх удзелу ў даследаваннях самастойнай працы. Тут творчасць настаўніка выражаецца перш за ўсё ў пошуку новых метадаў навучання і выхавання, у стварэнні метадычных распрацовак, няспынным прафесійным росце, пошуку новых ведаў, пераглядзе састарэлых формаў правядзення ўроку. Аднак зноў трэба падкрэсліць, што творчасць заснавана не толькі на выкарыстанні навейшых распрацовак, а і на адпаведным стаўленні настаўнікаў да вучняў: "адносіны між настаўнікам і вучнем мусяць быць строга індывідуальнымі – дзіця настолькі будзе свабодным, наколькі настаўнік ведае яго характар, інтарэсы, імкненні" [5, с. 105].

Узброены такімі ведамі, педагог здольны аказаць падтрымку вучню, скіраваць яго намаганні ў патрэбным напрамку. Тут варта помніць, што вопыт і веды дарослага чалавека не заўсёды толькі спрыяюць творчаму працэсу, але іншы раз і моцна ўскладняюць яго. Вобразы, народжаныя ўяўленнем дзіцяці, у большасці выпадкаў яшчэ не схільныя накладвацца на жыццёвы вопыт дарослага чалавека. Таму вялікае значэнне тут мае ўменне настаўніка мякка, тактоўна, без маральна-псіхалагічнага ціску кіраваць творчым працэсам навучання, бо "ўдзел настаўніка ў акце творчасці праяўляецца праз наданне вучню ўпэўненасці ў сваіх магчымасцях, разуменне яго імкненняў і ўпэўненасці ў яго поспеху" [5, с. 106].

Эфектыўным сродкам у развіцці творчых якасцяў асобы вучня можа стаць гульня. "Гульня – гэта іскра, якая запальвае ў дзецях агеньчык пытлівасці", – адзначаў В.А.Сухамлінскі [6, с. 93]. На сённяшні дзень існуе некалькі метадычных дапаможнікаў, прысвечаных выкарыстанню гульні на ўроках гуманітарнага цыкла. Разгледзім некаторыя з іх.

У праграмна-метадычных рэкамендацыях "Игра и дети" [2], распрацаваных выкладчыкамі кафедры педагогікі БДПУ імя М.Танка, гульня разглядаецца як метад ускоснага педагагічнага ўздзеяння на асобу: "прайграючы розныя сітуацыі, жыццёвыя і выдуманыя аж да фантастычных, выхаванцы вучацца ў думках ставіць сябе ў самыя нечаканыя ўмовы і натуральна рэагаваць на іх сваімі паводзінамі – у залежнасці ад уласнага характару і светаўспрымання" [2, с. 11]. Тут

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

важна, каб падлетак не адчуваў сябе аб'ектам уздзеяння дарослага, ён павінен усведамляць сябе паўнапраўным суб'ектам дзейнасці. На падставе гэтага аўтары робяць выснову пра тое, што гульня – асаблівы метад далучэння дзяцей да творчай дзейнасці, метад стымулявання іх актыўнасці [2, с. 11].

У адпаведнасці з псіхолага-педагагічнай канцэпцыяй гульня разглядаецца як працэс актыўнага мыслення, а навучанне – як працэс адцягненага мыслення. Вось чаму ўрокі-гульні, накіраваныя, у прыватнасці, на развіццё ўяўлення, фантазіі і творчасці, – гэта своеасаблівая школа эмоцый, дзе радасць сумесных перажыванняў і адкрыццяў узнікае ў выніку яднання пачуцця і розуму.

У згаданай кнізе падаюцца тэхналогіі выкарыстання гульні як метада ўскоснага ўздзеяння на асобу: урок-гульня "В страну игр" [2, с. 45], урок-гульня для пачатковых класаў "Мы играем и поём – вместе весело живём" [2, с. 43], гульні для развіцця фантазіі, уяўлення, творчасці [2, с. 31] і інш.

Сапраўды, у сваёй поўнай, развітай форме творчая пазіцыя педагога – гэта важны кампанент яго дзейнасці. Уменне ствараць гульнёвыя сітуацыі, далучаць да іх сваіх выхаванцаў, удзельнічаць самому з'яўляецца прыкметай найвышэйшага прафесіяналізму. Бясспрэчна і тое, што сістэматычнае і мэтанакіраванае выкарыстанне гульні дазволіць павялічыць прадуктыўнасць творчага мыслення настаўнікаў і вучняў, а самае галоўнае пазбавіць адукацыйны працэс механічнай перадачы ведаў і вопыту.

У кнізе "Игра в процессе обучения" [7], створанай лабараторыяй навукова-тэхнічных інавацый РІВШ, разглядаюцца не толькі пытанні тэорыі і методыкі дыдактычнай гульні, тэхналогіі яе распрацоўкі выкарыстання, але і дзейнасць педагога-выкладчыка на шляху да творчай рэалізацыі задуманага. Аўтары справядліва сцвярджаюць, што "дзейнасці выкладчыка, калі ён выступае не проста прадметнікам, але і педагогам, які вучыць і выхоўвае маладое пакаленне, унутрана ўласціва гульнёвая дзейнасць" [7, с. 10]. На ўроку, на думку аўтараў апошняй кнігі, настаўніку адводзіцца "роля рэжысёра як асобы, якая кіруе пастаноўкай "спектакля-ўрока", лекцыі і г.д." [7, с. 9]. І каб выканаць гэтую ролю, не трэба ўспрымаць гульню як нешта несур'ёзнае. Педагог стварае свой тэатр, дзе адбываецца не толькі перадача ведаў, а ствараюцца праблемна-пазнаваўчыя сітуацыі і падыход да кожнага вучня (як да асобнага акцёра ў сапраўдным тэатры) адбываецца з улікам іх індывідуальных здольнасцяў.

Трэба яшчэ раз адзначыць, што паўнацэннае навучанне магчыма толькі пры актыўнай дзейнасці вучняў, якая накіроўваецца настаўнікам, зацікаўленым у прадуктыўнай педагагічнай дзейнасці, а не механічнай перадачы ведаў. Самы небяспечны стан выкладчыка – гэта стан поўнай апатыі да таго, што ён робіць. Толькі ва ўмовах творчай атмасферы на ўроках настаўнік зможа дасягнуць вышынь свайго майстэрства, і ў гэтым яму абавязкова дапаможа гульня.

*ЛІТАРАТУРА*

1. ***Выготский Л.С.*** Психология искусства. – М., 1968.
2. ***Гримоть А.А., Луцевич Е.В., Пенкрат Л.В.*** Игра и дети. – Мн., 1996.
3. ***Гуркевіч В.М.*** "Творчасці зярняткі залатыя...": Метадычныя эцюды настаўніка. – Мн., 1988.
4. ***Малькова З.А.*** Школа и педагогика за рубежом. – М., 1983.
5. ***Полуянов Ю.А.*** Перспективы реализации идей Л.С.Выгодского о детском и художественном творчестве // Вопросы психологии. – 1997. – № 1.
6. ***Сухомлинский В.А.*** Как воспитать настоящего человека. – Мн., 1978.
7. ***Трофимов З.П., Лутохина Э.Я. Наумова С.А.*** Игра в процессе обучения. – Мн., 1995.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

## SUMMARY

*The creative potential of game in the process of teaching humanitarian subjects is considered in the article. The problem of developing the pupils' abilities through their active and interested activity at the lessons of Literature is in the centre of author's attention. The pedagogical value of game as an effective method of organizing the educational process is revealed here.*